# Грыбаедаў на Беларусі

133 гады таму назад, на працягу 3-х гадоў на Беларусі пражываў вядомы рускі пісьменнік Аляксандр Сяргеевіч Грыбаедаў.

У гэтыя гады (1813 — 1816) ён служыў на тэрыторыі Беларусі, спачатку ў Іркуцкім кавалерыйскім палку, а потым у штабе кавалерыйскіх рэзерваў у горадзе Брэст-Літоўску. Тут ён і напісаў у 1814 г., свае першыя артыкулы, якія былі змешчаны ў друку: «Аб кавалерыйскіх рэзервах» (часопіс «Вестник Европы», 1814 г. № 13, стар. 116 — 124) і «Пісьмо з Брэст-Літоўска да выдаўца» (часопіс «Вестник Европы» 1814 г., № 13, стар. 228 — 233).

У першым артыкуле аўтар разглядае значэнне кавалерыйскіх рэзерваў у справе абароны радзімы і працэс іх фарміравання ў 1813 — 1814 гг. У другім артыкуле ён апісвае пікнік у ваколіцах Брэст-Літоўска ў гонар генерала кавалерыі Калагрывава, які ўзначальваў штаб кавалерыйскіх рэзерваў у Брэст-Літоўску. Празаічныя радкі чаргуюцца з вершавымі куплетамі. Першыя артыкулы Грыбаедава, напісаныя ім у часе прабывання на Беларусі і ў якіх апісваюцца падзеі, што адбываліся на тэрыторыі Беларусі, маюцца ў Дзяржаўнай бібліятэцы імені Леніна.

У пазнейшыя гады Грыбаедаў прыязджаў неаднойчы ў Гомель. Наведваючы сваякоў, ён спыняўся ў палацы Паскевіча. Жонка фельдмаршала Паскевіча была цёткай пісьменніка. Адзін з шматлікіх рукапісаў «Горя от ума» з паметкамі самога аўтара захоўваўся да 1941 г. у Гомельскім гістарычным музеі, які змяшчаўся ў палацы Паскевіча.

**Н. ВАТАЦЫ.**